УДК 882.6 «18/19»

Н. М. Якуш, дацэнт

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧ. XX СТ.: СЦВЯРДЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

The article examines nation-forming and patriotic functions of Belarusian literature as prerequisites of political development of the national idea.

**Уводзіны.** Па характару ўзаемаадносін нацыянальнага і агульначалавечага беларуская культура выступала як адкрыты тып, генэзіс якога абумовілі гісторыя беларускага этнасу, рэлігійны ўплыў, перэпітыі станаўлення дзяржаўнасці. Даследчыкі адзначаюць эмацыянальную стрыманасць традыцыйнай эстэтыкі, феномен «тутэйшасці» як ізаляцыяніісцкае паразуменне свойскасці, імкненне да лакалізацыі месца жыцця, кансерватызм светапогляду этнічнай беларускай культуры. Разам з гэтым элітарная культура беларусаў пастаянна дэманстравала тэарэтычную успрымальнасць, здольнасць да творчага засваення і перапрацоўкі прагрэсіўных культурных набыткаў чалавецтва.

У другой палове XIX ст. прастора беларускай культуры істотна мяняецца і пашыраецца пад уздзеяннем развіцця капіталістычных адносін. Фарміраванне беларускай нацыі, абуджэнне нацыянальнага жыцця і актыўнай барацьбы супраць усіх форм нацыянальнага прыгнёту вызначылі вектар культурнага развіцця. Гэта наглядна адлюстравала беларуская літаратура.

**Культурна-адраджэнчаскія і нацыятворчыя функцыі беларускай літаратуры.** Яшчэ ў першай палове XIX ст. у беларускім грамадстве выяўляецца звязаны з эстэтыкай рамантызму культурна-асветніцкі рух, які спрыяе культурна-этнаграфічнаму абуджэнню беларускасці і станаўленню мясцовага «краёвага» патрыятызму. Складванне беларусазнаўства як формы самаўсведамлення і самаспасціжэння народа садзейнічае ажыўленню ў 40-я–50-я гг. літаратурнай дзейнасці, якая дасягае сваёй кульмінацыі ў пачатку 60-х гадоў, напярэдадні і ў дні паўстання 1863–1864 гг. Творчыя пачынальнікі беларускай літаратуры былі цесна звязаны з польскай культурай, літаратурай і польскім культурна-літаратурным асяроддзем, аб чым сведчыць мастацтва Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча. Аднак схіляючыся да адлюстравання ці самавыяўлення мясцовага генатыпу, гэтая літаратура несла ў сабе патэнцыял пераходнасці ад традыцыйнага польскамоўнага ўзнаўлення акаляючага жыцця да беларускамоўнага ўвасаблення творчых задумаў, спрыяла развіццю духоўнасці [1]. Пры гэтым ідэя братэрскага ўзаемаўзгодненага дыялогу як стваральнай і аб’яднальнай духоўнай энергіі з’яўляецца пануючым фактарам мастацкага тэксту, нават калі прынцып кампрамісу, узаемаузгодненасці і ўзаемаразумення ў адкрытых формах сюжэтнага дзеяння рэзка парушаецца.

На казачна-фантастычных, сімволіка-алегарычных і міфалагічных шляхах беларуская літаратура XIX ст. па-свойму інтэнсіўна шукала і сутнасць той ісціны, што звязвалася з разуменнем паняцця Радзімы і яе дзяржаўна-нацыянальнай будовы, існаванне і функцыяніраванне якой у прасторава-часовым кантынууме міфалагізіраванай этнічнай гісторыі выступалі як з’ява сакральнай каштоўнасці, супаставімай з каштоўнасцямі хрысціянства [2]. Гэтая тэндэнцыя была адной з перадумоў палітычнага афармлення нацыянальнай ідэі, што прадэманстравала беларускамоўная публіцыстыка К. Каліноўскага.

К. Каліноўскі ўпершыню аб’яднаў сацыяльна-эканамічныя і культурна-духоўныя праблемы ў ходзе вызваленчай барацьбы, выставіў уласна беларускія патрабаванні ў агульнапольскім і нацыянальным руху. Публіцыстыка Каліноўскага зрабіла вялікі ўплыў на ўсю наступную беларускую літаратуру, садзейнічала паглыбленню ў мастацкай культуры прынцыпаў рэалізму і народнасці, замацаванню высокіх ідэалаў у барацьбе за свабоду. Друкаваная і рукапісная спадчына Каліноўскага па аб’ёму невялікая (7 нумароў газеты «Мужыцкая праўда», у якой ён умела выкарыстоўвае форму народнай гутаркі, шэраг рэвалюцыйных інструкцый, заклікаў, загадаў, а таксама некалькі лістоў, у тым ліку і вядомыя «Пісьмы з-пад шыбеніцы»). Тым не менш гэтая спадчына ўтрымлівае ў сабе шэраг глыбокіх ідэй і тэарэтычных палажэнняў. У аснове светапогляду Каліноўскага ляжала вера ў магутныя творчыя сілы народа, але пакуль народ не будзе свабодным, не будзе ні справядлівасці, ні багацця, ні навукі.

На беларускай мове Каліноўскім напісаны матэрыялы «Мужыцкай праўды», «Пісьмы з-пад шыбеніцы», некалькі загадаў-зваротаў да народа ад імя паўстанчаскага кіраўніцтва. Газета і «Пісьмы...» напісаны ім у форме маналогу бывалага і разумнага «Яські-гаспадара», які пазбыўся царысцкіх ілюзій і можа «вучыць сваёй мужыцкай праўдзе». Сатыра, іронія і смутак, трапнае народнае параўнанне і сімволіка – вельмі багатая палітра мастацкіх сродкаў Каліноўскага і выказаных ім пачуццяў.

Паразуменне паўстання 1863–1864 гг., у якім прама ці ўскосна ўдзельнічалі ўсе беларускія

пісьменнікі таго часу, і рэпрэсіі пасля яго затрымалі развіццё беларускай літаратуры. Толькі ў 90-я гг. зноў пачынаюць выходзіць творы на беларускай мове, з'явіліся пераклады з польскай, рускай, украінскай моў. Для гэтага выкарыстоўвалася першая прыватная газета на Беларусі «Минский листок», а таксама выдадзеныя ў 1889–1893 гг. календары.

Пасля доўгага перапынку беларускае друкаванае слова выйшла ў свет кірыліцай за межамі краю. У літаратуру паступова ўвайшлі Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч, Ф. Тапчэўскі і іншыя. Абапіраючыся на лепшыя традыцыі мінулага, яны надалі беларускай літаратуры новае гучанне, спрыялі абуджэнню беларускага нацыянальнага руху. Ва ўмовах адсутнасці самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця культура прыняла на сябе нацыянальна-аб'яднаўчыя і нацыянальна-патрыятычныя функцыі. Беларускія пісьменнікі павялі крытычную перапрацоўку духоўнага патэнцыялу народа і зрабілі крокі ад ідэй нацыянальнай самасвядомасці як этнічнага фактару да ідэй нацыянальных як фактара ідэйна-палітычнага. Літаратура становіцца адной з практычных форм адраджэння, выпрацоўвае яго ідэйную платформу, выступае то пропаведдзю, то заклікам, то тлумачэннем. Народныя пісьменнікі выконваюць місію своеасаблівых ідэолагаў, якія маюць канкрэтныя класавыя карані і гістарычныя задачы. Ідэя ўсеагульнага брацтва, класавай салідарнасці па сутнасці вызначала аснову іх жыццёвай пазіцыі і творчага мастацкага крэда. Усё гэта надавала беларускай літаратуры сацыяльна-палітычную завостранасць і суадносіла з народнай, сялянскай культурай.

Выразна і поўна стрыжнявыя лініі літаратурнага працэсу вызначыла творчасць Ф. Багушэвіча, які стаў адным з заснавальнікаў крытычнага рэалізму і прадстаўляў рэвалюцыйна-дэмакратычную плынь беларускай культуры. Павага да людзей працы, роўнасць усіх людзей, адданасць Радзіме – галоўныя грамадскія ідэалы паэта. У сваёй творчасці Багушэвіч здолеў таленавіта спалучыць гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне лёсу беларускага народа, які пісьменнік заклікае да нацыянальнага абуджэння. Палітычная і грамадская пазіцыя Багушэвіча знайшла адлюстраванне ў прадмове да зборніка «Дудка беларуская», дзе былі выкладзены погляды на беларускую мову. У прадмове азначаны вехі гісторыі краю з часоў Вялікага княства Літоўскага, у якім Беларусь была «як тое зерне ў гарэху», прыблізна акрэслена яе тэрыторыя. Пры гэтым Багушэвіч імкнуўся асэнсаваць палітычную традыцыю ў гісторыі беларускага народа ў кантэксце гісторыі народаў польскага, украінскага, літоўскага, чэшскага, балгарскага, татарскага, яўрэйскага і другіх і інтуітыўна верыў у гістарычны прагрэс. Ідэйная спадчына Багушэвіча станоўча ўплывала на сучаснікаў пісьменніка, а пасля на раннюю творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

Менавіта гэтыя і іншыя дзеячы літаратуры занялі вядучае месца ў культуры беларускага народа пачатку XX ст. і аказалі ўплыў на развіццё другіх галін духоўнага жыцця. Свабода і воля – ключавыя словы ў мастацкім лексіконе двух волатаў беларускай літаратуры – Купалы і Коласа, нягледзячы на ўсю адрознасць іх эстэтычных сістэм і метадалагічных крэда. З першых крокаў уваходу ў літаратуру для Купалы і Коласа было вельмі важным бескампрамісна праўдзіва і аб'ектыўна намаляваць сацыяльныя абставіны, у якіх гараваў ды бедаваў, чымся жыў ды радаваўся просты чалавек, селянін. І малюнкі людской бядоты ў іх творах у многіх выпадках сапраўды жудасныя. Нярэдка надзвычай завостраныя і густа афарбаваныя ў змрочныя фарбы малюнкі сялянскай пакуты вынікалі з сур'ёзнай веры рэвалюцыйна настроеных пісьменнікаў, што шматгадовая несправядлівасць у адносінах да беларускага селяніна павінна была б непазбежна падвесці таго да думкі вырвацца на свабоду. Як сведчаць даследчыкі, Купала і Колас праз стварэнне вобраза беларуса прадставілі два розных па мастацка-эстэтычнаму светаадчуванню канцэпты свабоды [3].

Творчасць двух найбуйнейшых дзеячаў беларускага слова была так цесна звязана з бурлівымі і зменлівымі падзеямі грамадскага жыцця, што тыя істотна ўплывалі на эстэтыку і сістэму пазнання жыцця, мянялі пошукавы рух мастацкага слова, звязвалі яго з аналітычнай думкай. На гэтым кірунку іх мастацкае слова ўмацоўвала сваю гуманістычную сілу, паглыбляла пазнавальна-філасофскую энергію і разнастаіла выяўленча-вобразную псіхалагічную палітру, што дапамагала глыбока асэнсаваць усе параметры беларускай культуры, рысы беларускага характару.

Паняцце нацыянальнага космасу беларусаў Колас падае праз яркае перажыванне арганічнага адзінства з прыродай. Эстэтыка пісьменніка ахоплівае ў прыродзе ўсё звонкае, простае, гарманічна суадносіць нябеснае і зямное, вялікае і малое, стварае нацыянальны эталонны беларускі пейзаж, праз які раскрывае духоўную існасць беларуса. Сваіх герояў Я. Колас выводзіць да Поля і Лесу (Міхал, Антось – «Новая зямля», Лабановіч , дзед Талаш).

Унутраны сэнс Коласа заключаецца ў тым, каб напомніць аб парушанай арганічнай сувязі чалавека з навакольным асяроддзем. У паэме «Сымон-музыка» Колас разглядае мастака-творцу як часцінку Космасу. Сымон – сувязны паміж прыродай, народам і сакральным светам, вышэйшая праява душы народа. Спадчына

Коласа адлюстроўвае і выяўляе галоўную ідэйна-эстэтычную дамінанту беларускай культуры: імкненне да сусветнай гармоніі, жыццёвасцвярджальная сіла.

Я. Купала становіцца душою нацыі і прарокам беларускага адраджэння. У пачатку XX ст. (1905–1915 гг) ён быў цалкам звязаны з нацыятворчым працэсам, фарміраваў самабытны духоўны воблік беларусаў, развіваў самасвядомасць, шліфаваў беларускую літаратурную мову, вызначаў культурныя каштоўнасці і ідэалы нацыі. Нацыянальна-патрыятычныя ідэі знаходзілі адлюстраванне і ў мастацкіх творах пісьменніка, і ў асветніцкай літаратуры, праз якую Купала мэтанакіравана тлумачыў беларускаму мужыку, што ён менавіта беларус, а не якісьці «тутэйшы», «паляк» ці «рускі», што нельга блытать «веру і нацыянальнасць».

Неарамантычная тэндэнцыя творчасці Купалы прарывалася праз ідэалізацыю мінулага, яго супрацьпастаўленне нецікавай, небеларускай сучаснасці («Над сваёй Айчынай», «Курганы», «З мінуўшых дзён»). Яго творчасць паказвала беларусу самога беларуса ў гістарычнай перспектыве і рэтраспектыве, фарміравала гонар і нацыянальнае самапачуццё, самапавагу, надавала годнае імя Чалавека і Чалавека-Беларуса.

Творчасць Я. Коласа і Я. Купалы выступіла адначасова як прычына і вынік нацыянальна-культурнага абуджэння беларусаў, лагічным накірункам якога стаў рух да ўласнай культуралагічнай думкі, яе палітычнага канцэптуальнага афармлення і філасофскага выяўлення.

Прыкметную ролю ў гісторыі беларускай культуры і літаратуры адыграла газета «Наша ніва», якая ставіла важнейшай задачай падтрымку ўсіх форм народнай самадзейнасці, усебаковае развіццё духоўнай культуры беларускага народа, стварэнне арыгінальнага нацыянальнага стылю ў мастацтве і літаратуры. Газета друкавала творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, З. Бядулі, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, К. Каганца, У. Галубка, А. Гаруна і др. «Нашаніўскі» перыяд беларускага адраджэння адыграў важную ролю ў пераадоленні аднабаковых поглядаў на беларускую культуру як на этнаграфічную традыцыю. Нашаніўцы-інтэлігенты імкнуцца адрадзіць назву «Беларусь», замацаваць яе за ўсёй тэрыторыяй, прыдаць палітычнае гучанне. У выніку яны прыходзяць да ідэі цеснай сувязі нацыянальнай самасвядомасці з існаваннем уласнай нацыянальнай дзяржавы. Тэарэтычным абгрунтаваннем гэтай ідэі становіцца канцэпцыя нацыянальнага адраджэння як гістарычнай заканамернасці ў развіцці культуры народаў, «адціснутых» з гістарычнай авансцэны.

**Высноўа.** Такім чынам, беларуская літаратура канца XIX – пачатку XX ст. узяла на сябе адказнасць за будучыню народа і місію адвесці ад яго гістарычную катастрофу, абуджаючы сілу і энергію беларусаў для заяўлення сваёй прысутнасці ў свеце. Фактычна сама літаратура стала сцвярджэннем гэтай прысутнасці і праявай нацыянальнага адраджэння як фундаментальнага гістарычнага пералому ў жыцці беларускага народа, літаратурна выяўляючы яго ідэалогію, псіхалогію і фарміруючы асноватворчыя прынцыпы нацыянальнага жыцця, вызваленага ад ланцугоў чужаземнага панавання і ўласнага пакорлівага прыніжэння.

### Літаратура

1. Мархель, У. Прысутнасць былога / У. Мархель. – Мінск, 1997.

2. Даніленка, С. Сакралізацыя вобраза Радзімы ў беларускай літаратуры першай палові XIX ст. (у творах Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча): аўтарэф. дыс. … канд філалаг. навук / С. Даніленка. – Мінск, 1997.

3. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя / І. Э. Багдановіч. – Мінск, 2001.